**Пытанні і заданні.** **1.** На якія групы падзяляюцца жывёлы ў залежнасці ад іх месцаў пражывання? **2.** Прывядзіце прыклады жывёл лесу. **3.** Якія жывёлы з'яўляюцца насельнікамі вадаёмаў? **4.** Назавіце жывёл, якіх можна сустрэць у полі ці на лузе. **5.** Чаму жывёлы селяцца побач з жыллём чалавека? Прывядзіце прыклады такіх жывёл.

# § 60. Узаемаадносіны чалавека і жывёл. Ахова жывёл

**Успомніце:** Якое значэнне маюць жывёлы ў жыцці чалавека?

**Змена колькасці жывёл пад уплывам дзейнасці чалавека.** Гаспадарчая дзейнасць чалавека можа прывесці да зніжэння колькасці і нават знікнення некаторых відаў жывёл. Гэта асушэнне зямель, нерацыянальнае выкарыстанне мінеральных угнаенняў, забруджванне паветра адходамі, пашырэнне транспартнай сеткі аўтамабільных дарог і чыгункі, высечка лясоў, браканьерства.

Гаспадарчая дзейнасць чалавека прывяла за апошнія стагоддзі да таго, што на тэрыторыі нашай краіны перасталі існаваць больш за 20 відаў пазваночных жывёл: *тур* (першабытны бык), *расамаха*, *бялуга* і інш. На мяжы поўнага знікнення знаходзіліся *зубр еўрапейскі*, *алень высакародны*, *бабёр рачны*, *мядзведзь буры* і інш.

Скарачэнне відавой разнастайнасці жывёл змушае людзей шукаць шляхі вырашэння гэтай праблемы. У Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні вызначаны тэрміны і маштабы нарыхтоўкі рыбы, дзічыны, пушніны, выкарыстання жывёл у навуковых, культурна-асветных і эстэтычных мэтах.

**Рассяленне жывёл і аднаўленне колькасці відаў, якія знаходзяцца на мяжы знікнення.** Шляхам рассялення (з'яўленне жывёл за межамі вобласці іх распаўсюджвання, якое ажыццяўляецца без прамога ўдзелу чалавека) адноўлена колькасць *бабра рачнога*, *лася*. Знаходзіцца на стадыі аднаўлення колькасць *зубра еўрапейскага* і *аленя высакароднага*.

Дзякуючы акліматызацыі (рассяленне жывёл за межы іх арэала, якое ажыццяўляецца з прамым удзелам чалавека) вадаёмы нашай краіны папоўнілі больш за 10 відаў каштоўных рыб: *стронга вясёлкавая*, *таўсталобік белы*, *таўсталобік стракаты*, *карась сярэбраны*, *амур белы* і інш.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

Рассяленне віду можа адбыцца выпадкова. Напрыклад, *ратан* у вадаёмах Беларусі з'явіўся з ікрой і малькамі таўсталобіка і амура белага пры іх акліматызацыі. Дарослыя ратаны наносяць шкоду, кормячыся ікрой і малькамі рыб, п'яўкамі, трытонамі, лічынкамі земнаводных (апалонікамі). Яны здольны цалкам вынішчыць прадстаўнікоў іншых відаў рыб у невялікіх вадаёмах.

**Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі.** Галоўную ролю ў вырашэнні задачы аховы жывёл выконваюць ***асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі*** (ААПТ) — запаведнікі, нацыянальныя паркі і заказнікі. Усе ахоўныя тэрыторыі займаюць каля 9 % плошчы Рэспублікі Беларусь.

**Запаведнік** — гэта ААПТ, галоўнай задачай якой з'яўляецца захаванне разнастайнасці прыродных супольнасцей, вывучэнне іх жыцця, назіранне за зменамі ў жывой абалонцы Зямлі (біясферы). Гаспадарчая дзейнасць чалавека ў запаведніку забаронена. На тэрыторыі нашай краіны знаходзіцца ўнікальны сусветна вядомы *Бярэзінскі біясферны запаведнік* (мал. 203). У ім была адноўлена колькасць баброў.

**Нацыянальны парк** — гэта ААПТ, задачай якой з'яўляецца не толькі захаванне разнастайнасці прыродных супольнасцей, але і арганізацыя экалагічнага турызму і адпачынку. У Беларусі дзейнічаюць





Возера Плаўна



Экалагічная сцежка

**Мал. 203.** Бярэзінскі біясферны запаведнік

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

чатыры нацыянальныя паркі — «Белавежская пушча», «Браслаўскія азёры», «Прыпяцкі» і «Нарачанскі». Арганізацыя нацыянальнага парку «Белавежская пушча» дазволіла захаваць зубра і павялічыць яго колькасць.

**Заказнік** — гэта ААПТ, дзе пад аховай знаходзяцца не ўсе жывёлы і расліны, а толькі іх пэўныя віды. У нашай краіне дзейнічае каля 100 дзяржаўных заказнікаў рэспубліканскага значэння. На тэрыторыі заказніка забаронена дзейнасць, здольная адмоўна паўплываць на ахоўныя віды.

**Чырвоная кніга.** У 1963 годзе па ініцыятыве Міжнароднага саюза аховы прыроды была апублікавана Чырвоная кніга жывёл, колькасць якіх катастрафічна паменшылася і якія патрабавалі тэрміновай і дзейснай аховы. Чырвоная кніга — гэта афіцыйны дакумент, што змяшчае інфармацыю пра ўсіх рэдкіх жывёл або віды, якія знікаюць ці знаходзяцца пад пагрозай знікнення (чырвоны — колер небяспекі).

З ***Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь*** можна даведацца, якія віды жывёл і раслін падлягаюць спецыяльнай ахове на тэрыторыі нашай краіны. Дакумент перыядычна змяняецца: у яго ўключаюць віды жывёл, якія знікаюць, і выдаляюць тыя віды, за колькасць якіх ужо можна не баяцца. Сёння ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь уключана каля 200 відаў дзікіх жывёл, з іх каля 100 відаў беспазваночных, 2 віды земнаводных, 2 віды паўзуноў, 9 відаў рыб, 70 відаў птушак, 20 відаў млекакормячых.

**Паўторым галоўнае.** Асноўным фактарам, якія прыводзіць да знікнення жывёл, з'яўляецца гаспадарчая дзейнасць чалавека. Аднаўленню колькасці жывёл спрыяюць іх рассяленне і акліматызацыя. Комплекс мер па захаванні відавой разнастайнасці жывёл нашай краіны ўключае стварэнне асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь, законаў, якія рэгулююць промысел (паляванне і рыбалку).

**Пытанні і заданні.** **1.** Назавіце віды чалавечай дзейнасці, якія прыводзяць да зніжэння колькасці жывёл. **2.** З якой мэтай праводзіцца акліматызацыя? **3.** Якія асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі вам вядомыя? **4.** Чым адрозніваюцца запаведнікі ад заказнікаў? **5.** Назавіце афіцыйны дакумент, створаны ў нашай краіне для аховы жывёл.

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»